ТРЭБА НЕ АТРЫМЛІВАЦЬ, А ЗАРАБЛЯЦЬ

па вытворчасці паліўных шчэпак. У іх ператвараюцца адходы. Не прападае абсалютна нічога. Пілавінне прадаецца сельскагаспадарчым прадпрыемствам як подсціл для жывёлы. Паралельна поўным ходам ідзе капітальны рамонт у будынку: падводзіцца ацяпленне, рамантуюцца душавыя і ўвогуле ствараюцца годныя ўмовы для працы людзей. **Начальнік участка Міхаіл ДАШКЕВІЧ** гаворыць, што вакансій сёння тут няма:

— Людзі ж зацікаўлены не страціць работу. Такіх перамен, якія адбыліся, мы не чакалі. Цяпер пабачылі на свае вочы — што тут можна зрабіць і як тут можна зарабляць.

Начальнік Слабадскога ўчастка па перапрацоўцы драўніны Міхаіл ДАШКЕВІЧ.

Слабадскі аб'яднаны майстарскі ўчастак па перапрацоўцы драўніны.

ЕЎРАПАДДОНЫ І ПЕЛЕТЫ НА ЭКСПАРТ

Другую лінію па перапрацоўцы драўніны разам з адноўленым цалкам памяшканнем Андрэй Марачкоўскі плануе запусціць да канца 2018 года. Да таго ж створыцца больш за дзясятак працоўных месцаў для жыхароў вёскі Слабада. У перспектыве ўчастак павінен цалкам працаваць на экспарт. Сёння замежныя спажыўцы з 10 краін больш за ўсё зацікаўлены ў пастаўках апрацаванай дошкі для еўрападдонаў. Яны ж купляюць у мазыран калы для вырошчвання вінаграда. Перспектыва — вытворчасць пелетаў для ацяплення. Апошні прадукт можа стаць яшчэ адным важным кірункам экспартнай будучыні гэтага падраздзялення, упэўнены Андрэй Марачкоўскі:

— Сёння зарабляем грошы і ўкладаем іх у вытворчасць. Мы будзем імкнуцца выпускаць больш гатовай прадукцыі, якая практычна ўся пойдзе на экспарт. Гэта прынясе і стабільны заробак людзям. Сёлета плануем паставіць сушылку драўніны. Гэта дасць магчымасць выпускаць дошку з яшчэ большай дабаўленай вартасцю.

ЛЯСНАЯ СЕРТЫФІКАЦЫЯ ГАРАНТУЕ

На ўнутраным рынку паспяхова рэалізуюцца лесаматэрыялы круглыя, дровы, венікі гаспадарчыя, сеянцы, саджанцы. Уся сертыфікаваная прадукцыя лясгаса маркіруецца знакам лясной сертыфікацыі. Мазырскі лясгас мае нацыянальны сертыфікат адпаведнасці па сістэме лесакіравання і лесакарыстання, а таксама сертыфікаты адпаведнасці міжнароднага значэння PEFS і FSC. У пункце радыёлагічнага кантролю лясгаса праводзіцца радыёметрычны кантроль прадукцыі. Гэта таксама дазволіла ўмацаваць пазіцыі на міжнародным і ўнутраным рынку.

АДПАЧЫНАК ДЛЯ АМАТАРАЎ

— А яшчэ ў нас ёсць свой пчальнік на 100 сем'яў. Мы ўжо атрымліваем экалагічна чысты мёд, — расказвае дырэктар Мазырскага лясгаса. — У аддаленай вёсцы Гіневічаў Груд размешчаны домік паляўнічага. Там камінная зала, кухня з гарачай вадой. Побач лазня, мангал, альтанка для летняга адпачынку, вальеры для сабак, стаянка для аўтамабіляў... З вясны да восені ў дамку практычна няма свабодных месцаў. Аматараў палявання парадуюць некранутыя лясы, дзе можна паляваць на дзіка, лася, бабра, казулю, зайца, ваўка, лісіцу, вадаплаўную дзічыну. Зусім недалёка — Ляшнянскае возера, дзе мы вырошчваем рыбу. Там зрабілі зону адпачынку з неабходнай інфраструктурай: альтанкі з мосцікамі, пад'язныя шляхі, стаянка ахоўваемая... Усё для ціхага і прыемнага адпачынку на прыродзе. Думаем, аматары рыбалкі гэта месца ацэняць па заслугах ужо сёлета. І надалей будзем гэты кірунак развіваць.

ПАРАДАК І ЭКАНОМІЯ

Па выніках работы ў 2016 годзе Мазырскі лясгас увайшоў у пяцёрку вядучых лясных гаспадарак краіны. А летась яго ўрачыста занеслі на Рэспубліканскую дошку Гонару — за эканомію рэсурсаў.

— Калі ў кожным кірунку шукаць эканомію, будуць прыбыткі, — гаворыць Андрэй Канстанцінавіч. — Напрыклад, на аўтатранспарт мы ўсталявалі сістэму GPS-сачэння і кантролю паліва. Цяпер людзі дакладна разумеюць, што калі ёсць эканомія, гэтыя грошы ім прыйдуць у якасці дадатковага заробку. Увогуле важна выхоўваць адказнасць супрацоўнікаў за ўсё, што навокал. Мы дамовіліся з усімі кіраўнікамі і спецыялістамі, што калі некуды едуць па справах, глядзяць, які парадак на тэрыторыі. Напрыклад, у якім стане прыдарожныя палосы. Пачалі ўстанаўліваць камеры для правядзення фотавідэафіксацыі ў лясах. І гэта прыносіць свой плён у выяўленні парушальнікаў закона. Таксама ў лясніцтвах на спецыяльных вежах устаноўлены відэакамеры, якія значна аблягчаюць сачэнне за лесам у сітуацыі пажарнай небяспекі. Дзяжурны ляснік-аператар бачыць на маніторы ўсё, што адбываецца ў наваколлі.

Тут пачынаецца тэрыторыя заказніка «Мазырскія яры».

З БЯДОЙ СПРАВІЛІСЯ ТАЛАКОЙ

У ліпені 2016 года Мазырскі вопытны лясгас напаткала сапраўдная бяда. У Раманаўскім лясніцтве ўраган паваліў лес больш чым на 500 гектарах. З дапамогай многіх арганізацый, а таксама прадпрыемстваў галіны, горада і раёна атрымалася ў сціслыя тэрміны высекчы паваленыя дрэвы на плошчы 760 гектараў. Але ж гэта толькі частка справы. Лесаводы звярнуліся па дапамогу да ўсіх жыхароў краіны, і ім прыйшлі на дапамогу. У выніку дабрачыннай акцыі «Тыдзень лесу — 2017» на месцы загінулых былі пасаджаны маладыя хвоі і бярозы.



Ляшнянскае возера чакае аматараў адпачынка на прыродзе.

БАРАЦЬБА З КАРАЕДАМ

У лесе часам — як на вайне. І ворага не адразу можна заўважыць, гаворыць **галоўны лясніччы Мазырскага лясгаса Мікалай ШАРЫГА:**

— З-за нашэсця караеда сёлета прыйдзецца высекчы да 1000 га хвоі. Зімой мы вызначаем дрэвы, якія ўжо пашкоджаны. Глядзім, дзе зялёныя галіны падаюць на снег. Расліны, у якіх зрадзела крона, зразаем, а галінкі тэрмінова спальваем. Пакуль гэта найбольш эфектыўны спосаб. Тыя, якія ўжо стаяць парыжэлыя, караед з'еў і з іх пайшоў далей. Таму ў першую чаргу трэба знішчаць дрэвы, якія ён пашкодзіў зараз.

Мікалай Сяргеевіч расказвае, што караед прыляцеў у Беларусь з поўдня і захаду, дзе аб'еў лясныя масівы ва Украіне і Польшчы:

— Да таго ж на становішча паўплываў шэраг падзей. Пасля вайны ў лясах садзілі толькі хвоі. Сёння вучоныя прыйшлі да разумення, што садзіць трэба мяшаны лес, у якім побач з хвоямі будуць бяроза і вольха. Мы цяпер так і робім. Масавая меліярацыя, асушэнне балот, пацяпленне клімату — усё гэта разам таксама адыграла негатыўную ролю. З-за недахопу вільгаці дрэвы аслабелі і сталі занадта ўразлівымі для шкоднікаў і інфекцый. Гэтай вясной у Бокаўскім лясніцтве паспрабуем правесці авіяапрацоўку спецыяльнымі прэпаратамі. Паглядзім, як караед адрэагуе.

Пад патранажам супрацоўнікаў Мазырскага лясгаса знаходзяцца мурашкі. Іх калоніі агароджаны драўлянымі платамі, каб дзікі, для якіх гэтыя казуркі далікатэс, не змаглі разбурыць мурашнік.

ЗААХВОЧВАННЕ ДЛЯ САМЫХ ЛЕПШЫХ

Па эканамічных паказчыках сярод прадпрыемстваў лясной галіны Мазырскі вопытны лясгас займае лідзіруючыя пазіцыі не толькі ў вобласці, але і ў краіне. Гэта станоўча адбіваецца як на заробках супрацоўнікаў, так і на дадатковых заахвочваннях, — адзначае дырэктар Андрэй Марачкоўскі:

— Тэхніка бяспекі, ахова працы, спецадзенне — у прыярытэтах на прадпрыемстве. Не менш важныя і сацыяльныя выплаты. Згодна з калектыўным дагаворам выплачваем так званую трынаццатую зарплату. Маладым спецыялістам — абавязковыя «пад'ёмныя», а тым, хто вучыцца ў ВНУ або каледжы, па выніках кожнай паспяховай сесіі — прэмія. Летам заказвалі аўтобус і калектыўна выязджалі на чатыры дні адпачываць у Адэсу. Пры гэтым у кожным лясніцтве вырашалі, хто лепш працаваў, не меў спагнанняў і дастойны заахвочвання. На ўсе святы мы імкнёмся сустракацца калектывам. У нашым лясгасе шмат дынастый і ветэранаў, якія нам перадалі ў спадчыну такое багацце — лес. Мы павінны падтрымліваць традыцыі папярэдніх пакаленняў. Багатыя лясныя ўгоддзі краю трэба пакінуць дзецям і ўнукам.

Ва ўрочышчы Старына Міхалкаўскага лясніцтва расце дуб, якому больш за чатырыста гадоў. Ён мае акружнасць амаль чатыры з паловай метры, а вышыня яго — больш за 40 метраў.



Тэрыторыя паляўнічага дамка ў вёсцы Гіневічаў Груд.

УНП 400036079